Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 4 (112) Серада 22-га лютага 1928 г. м. Вільня. Год III.

Беларускае Слова

Выходзіць раз у тыдзень

Цана нумару 20 грош.

Орган Незалежнай Дэмакратычнай Думкі.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
" " " 3 " 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрас Рэдакцыі і Адміністр. Wilno ul. Zawalna 6 m. 4, тэл. 14-35.
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
" У тэксце . —40 гр.
" На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыні ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

НА ПЕРАЛОМЕ.

У самы разгар выбарнай кампаніі наша рэдакцыя і наагул усе нашыя арганізацыі апынуліся ў стане, так сказаць, „вострага урадавага крызысу:“ Старшыня Бел. Нац. Рады і Партыі," галоўны кіраўнік газ. „Беларускае Слова“, Старшыня „Беларускае Хаткі у Вільні“ і сябра Камітэту па Справам Самаўрадаў п. А. Паўлюкевіч, з імем якога былі цесна зьвязаны гэтыя арганізацыі, зрокся усіх сваіх становішчаў і выйшаў нават з ліку іх сябраў. Прычынаў, змусіўшых яго зрабіць гэты крок, мы не падаем. Сьцьвярджаем толькі, што адгэтуль усякая сувязь паміж нашымі установамі і п. Паўлюкевічам рвецца цалком.

Але мы павінны тутака станоўча падкрэсьліць, што асабісты ўход кіраўніка нашых арганізацыяў знашчасьце не закрануў усяго створанага ў працягу гадоў нашай супольнай працаю жывога жыцьцяздольнага арганізму нашых культурна-нацыянальных арганізацыяў на чале з нашаю газэтаю Усё гэта жыло, жыве і будзе жыць і пасьля адыходу ад працы з намі быўшага нашага палітычнага кіраўніка п. Паўлюкевіча. Жывыя і здаровыя ідэйна і арганізацыйна, яны ня толькі безхваробна перанясьлі гэты „востры крызыс“, але мы спадзяемся, што гэты крызыс ў пэўнай меры выйдзе ім нават на карысьць. Адгэтуль гэтыя арганізацыі будуць абсалютна апалітычнымі, кіруючыся выключна тымі задачамі, якія ляжаць у іх арганічнай сутнасьці.

Учаснасьці наша газэта пастараецца больш зьвяртаць увагі на справы **разьвіцьця культурнага жыцьця і нацыянальнае сьвядомасьці беларускага народу, арганізацыю яго гаспадарчай сілы і сьвядомасьці, яго грамадзкага самаўзгадаваньня,** згары выракаючыся усялякай вузкай аднабокай палітычнай партыйнасьцю, ад якой цяпер на нашых сумных вачох разсыпаецца ў пясок усё беларускае грамадзянства, атручанае ўзаемнай ненавісьцю, грызьнёй ды лаянкай на радасьць усіх ворагаў беларускага народу.

Не навязваючыся беларускаму народу ў павадыры, мы павінны толькі з сумам сьцьвярдзіць, што ўсе тыя, хто слушна ці няслушна лічыць сябе гэтымі павадырамі, сваей узаемнай грызьней ды шальмаваньнем адзін аднаго зьніштожылі ужо самі сябе і моральна і палітычна, пакінуўшы шматпакутны беларускі народ у Зах. Беларусі без павадыроў і без ўсялякага павадырства.

На гэты страшэнны рэзультат надужываньня палітыкай наша газэта не перастане ніколі зьвяртаць увагу беларускага народу і ўсіх яго прыяцеляў з іншых родных яму народаў, з якімі ён воляй гістарычнага лёсу павінен мець сужыцьцё пад аднэй супольнай страхой Польскае Дзяржавы. Да гэтага мірнага сужыцьця ўсіх народаў, да супольнай іх культурна-гаспадарчай працы над узмацненьнем падставаў нашай супольнай Дзяржавы і асабліва дабрабыту Нашага Краю мы будзем заклікаць усіх беларусаў і надалей. Лёяльна ды сумленна мы будзем спаўняць усе абавязкі польскага грамадзяніна, накладзеныя на нас гістарычным лёсам. А гэта дасьць нам толькі падвойную сілу і павагу трэбаваць з боку Польскае Дзяржавы усіх належных нам роўных правоў яе вольнага грамадзяніна.

І гэта ня толькі ня зробіць нас, ані тых, хто нас паслухае, нацыянальна **не—беларусамі,** але наадварот — забясьпечыць нам найвялікшую свабоду разьвіцьця нашай чалавечай асобы і нацыянальнай індывідуальнасьці. А гэтае ўсё разам паставіць нас на найпэўнейшы шлях нашага ўсебаковага разьвіцьця і дасьць магчымасьць прыблізіць момэнт зьдзейсьненьня найшляхэтнейшага нацыянальнага ідэалу-дзяржаўнае незалежнасьці, да якой імкнуцца ў сваіх думках усе народы.

Але дайсьці да гэтага можна толькі шляхам бязупыннай мірнай працы і няўстаннага самаўзгадаваньня, і ніколі не шляхам якога-небудзь „рэвалюцыйнага выбуху“, які толькі вычэрпывае сілы, разпыляе людзей, выклікае перадчасны часовы „трыумф“, каб урэшце кінуць народныя масы ў прорву адчаю і пасыўнасьці, а пасьля ў новую няволю, часта, калі не заўсёды, горшую ад папярэдняй... Ці трэба прыводзіць прыклады ўсяго гэтага. Не, яны заўсёды перад нашымі вачыма залішне яшчэ сьвежыя як па гэты, так сама і па той бок усходняга кардону. Проці ўсіх гэтых **блудных, шкодных, агідных і бязбожных** шляхаў і спробаў барацьбы чалавека з чалавекам, народу з народам і дзяржавы з дзяржаваю мы будзем вязьці барацьбу ўсьцяж і надалей. А што датычыць „бальшавіцкага раю„, дык мы як былі, так і застанемся яго ворагамі.

А найлепшай гарантыяй таго, што пастаўленыя намі мэты могуць быць здейсьнены, служыць новы курс Ураду Маршалка Пілсудзкага ў адносінах да нацыянальных меншасьцяў Польскае Дзяржавы, ў тым ліку і да нас, Беларусаў.

Палітычны агляд.

Уся Заходняя Эўропа перажывае перадвыбарны пэрыяд. Польшча ўжо уступіла ў перадвыбарную барацьбу, а ў Нямеччыне, Францыі і Англіі толькі рыхтуюцца да гэтага пэрыяду. Дзеля гэтага

ў Заходне-Эўропэйскай палітыцы прыметна нейкае зацішша, ці вычаканьне.

Гэта зусім зразумела, бо ніякі з урадаў, калі ня лічыць польскага Ўраду Маршалка Пілсудзкага, на судзьбу якога вынікі новых выбараў не акажуць вялікага уплыву, ня хоча перад выбарамі прадпрыймаць рашучых крокаў у вонкавой палітыцы, каб непасьпехам не папсаваць сваіх шансаў на прадстаячых выбарах.

З гэтага палітычнага зацішша Заходняе Эўропы вывеў Штрэзэман сваею прамоваю ў Рэйхстагу аб загранічнай палітыцы Нямеччыны. У гэтай прамове ён крануўся самых балючых пытаньняў, якія цікавяць ня толькі адну Нямеччыну, але і яе суседзяў. Найбольш цікавым было тое, што адносіцца да Радавае Расеі. Масква, як ведама, засталася вельмі незадаволенаю гэтаю прамоваю. На гэта ёсьць важкія прычыны. Гаворачы аб гаспадарча-гандлёвых адносінах з Савецкаю Расеяй, Штрэзэман зусім выразна заявіў, што

Гандлёвы дагавор 1925 г. ня споўніў тых надзеяў, якія пакладала на яго Нямеччына.

Калі прыняць пад увагу з аднаго боку тое, што саветы спакушаюць Заходня-Эўропэйскія дзяржавы толькі сваім гандлем, а з другога боку Нямеччына мела найбольшыя для гэтага магчымасьці, як палітычная хаўрусьніца, дык будзе зусім зразумела, які удар саветам нанёс Штрэзэман сваею прамоваю. Гэтым ён расьпісаўся ў поўным правале нямецка-савецкага супрацоўніцтва у вобласьці гаспадаркі. А калі з гандлю з бальшавікамі засталіся незадаволенымі пасьля 3-х гадовага вопыту нават немцы пры ўсей сваей нявыбрэднасьці і дасканалай прыспасобленасьці і знаёмасьці з расейскімі варункамі, дык ня трэба тлумачыць таго, што гэта прамова будзе найлепшаю перасьцярогаю для тых дзяржаваў, як Францыя, Польшча, Англія, Амэрыка і інш., з якімі саветы яшчэ жадаюць заключыць гандлёвыя дагаворы.

Тут будзе зусім к месту адцяніць факт саўпадзеньня гэтай заявы Штрэзэмана з паездкаю польскае гандлёвае дэлегацыі да Масквы, якая вярнулася з пустымі рукамі. Ня гледзячы на міралюбівы настрой Польшчы ў адносінах свайго усходняга суседа і жаданьне ўнармаваць хаця-ж эканамічныя адносіны, гэта ніяк не ўдаецца. Якая прычына непамыснасьці польска-савецкіх гандлёвых перагавораў, польскія афіцыяльныя колы пакуль не далі высьвятленьняў. Прыходзіцца толькі лічыцца з фактам, што новая спроба з боку Польшчы дагаварыцца да чаго небудзь рэальнага з бальшавікамі ў вобласьці гандлёва-гаспадарчых адносінаў закончылася поўным правалам.

Ў адносінах Польшчы Штрэзэман у сваей прамове парушыў адну з найбольш трудна-вырашымых гаспадарчых праблемаў—гандаль рольнымі прадуктамі. Нямеччына да гэтай пары глядзіць на Усходнюю Эўропу у тым ліку і на Польшчу, як на пастаўшчыка толькі сырца. Нямеччына ўважае за лепшае купляць у Польшчы зярно і корм для статку і не дапускаць на свой рынак жывога статку і мяса з Польшчы. Аб гэты пункт разьбіліся польска-нямецкія перагаворы ў мінуўшым і трэба чакаць, што саставіць паважныя перашкоды ў будучыне. У каждым разе трэба падкрэсьліць у прамове Штрэзэмана значную умяркованасьць у адносінах Польшчы. Ён быў гэтак міралюбіва успасоблены ў адносінах Польшчы, што мусіў нават некалькі разоў устрымліваць нацыяналістаў, рэзка выступаючых проці Польшчы. Яго прамова зрабіла-бы зусім спрыяйнае ўражаньне ў Варшаве, калі-б не сапсаваў Вальдэмарас сваею візытаю ў Бэрліне.

Найперш чым распачынаць якія-небудзь крокі ў кірунку збліжэньня з Польшчаю, на падставе апошняй дэцызіі Рады Лігі Народаў, Вальдэмарас паехаў да Бэрліна за радаю. І зусім нечакальна быў падпісаны

нямецка-літоўскі гарантыйны дагавор.

Гэткім чынам Літва ужо мае гарантыйныя дагаворы з сваімі мацнейшымі суседзямі Нямеччынаю і Радаваю Расеяй. Гэтая абставіна бяз сумліву значна ўзмацняе міжнародовую пазыцыю Літвы і гарантуе яе палітычную незалежнасьць. Затым, па славам Штрэзэмана, гэты дагавор аблягчыць урэгуляваньне гандлёвых адносінаў з Літвою.

Што датычыць адносінаў з Францыяю, дык

Штрэзэман выказаў пэўную незадаволенасьць акупацыяй прырэйнскай вобласьці,

якая быццам не згаджаецца з духам Лёкарно. Пры гэтым ён іранічна указаў на тое, што узброеным Францыі і Англіі нечага баяцца разброянай Нямеччыны. Зусім зразумела, што на гэта зараз-жа адклікнуўся Парыж.— Брыян у сваей прамове у Сэнаце адказаў на прамову Штрэзэмана, што акупацыя Прырэйнскае вобласьці ня выходзіць за межы як вэрсальскага гэтак і лёкарнскага дагавору і ў кожным разе будзе ўтрымана да 1935 г., як гарантыя небясьпекі. Хаця некатарыя з францускіх газэтаў падалі, што Брыян ёсьць склонны распачаць з Нямеччынаю перагаворы аб зьмяншэньні францускіх акупацыйных атрадаў на далейшыя 10,000 чалавек. Але да гэтых перагавораў ня дойдзе перад выбарамі ва Францыі, ад вынікаў якіх залежыць далейшыя ўзаемныя адносіны з Нямеччынаю.

N.

Выбарныя сьпіскі у Віленскім округу № 63.

Акружная Выбарная Камісія Віленскага вокругу № 63 зацьвердзіла наступныя кандыдацкія сьпіскі да Сойму і Сэнату:

№ 1 Безпартыйны Блёк Супрацоўніцтва з Урадам.
№ 2. P. P. S (польскія сацыялістыя).
№ 3. P. S. L. „Вызваленьне“.
№ 18. Блёк нац. меншасьцяў (жыды і беларусы).
№ 20 Расейскае Народнае Аб'яднаньне.
№ 33 Агульна-жыдоўскі нацыянальны выбарны блёк.
№ 37 „Салідарнасьць работнікаў і сялянаў“.
№ 39 Беларускіх работнікаў і сялян.
№ 40 Беларускае сялянска-работніцкае аб'яднаньне.

Толькі да Сойму.

№ 4 Агульна-жыдоўскі работніцкі саюз „Бунд“.
№ 34 Незалежная сацыялістычная партыя працы.

Толькі да Сэнату.

№ 41 Беларускага працоўнага сялянства.
№ 10 Партыя хлопская.

Уневажняны.

№ 13 Работніцка-сялянскае Аб'яднаньне (камуністыя).
Сьпісак Саюзу дробных рольнікаў Гэльмана.
Сьпісак P. Z. L. Адраджэньне Стэфана Міцкевіча.
Сьпісак з Троцкае гміны нейкага Ліпніцкага.

У ЛІДЗКІМ ОКРУГУ.

№ 1 Безпартыйны Блёк Супрацоўніцтва з Урадам.
№ 2 P. P. S.
№ 3 Вызваленьне.
№ 13 Сялянска-работніцкае аб'яднаньне (камуністыя)
№ 20 Расейскае нац. аб'яднаньне.
№ 37 Сьпісак Цэнтральнага Агульна-Беларускага Народнага Выбарчага Камітэту (толькі да Сойму) Іванкевіч і Б. Падбярэзкі.
Беларуска-Польскае Аб'яднаньне сялян і работнікаў. (Грамада).
Мясцовы саюз абароны інтарэсаў сялян і работнікаў.
Беларускіх сялян і работнікаў Я. Станкевіча.
№ 4 Жыдоўскі Бунд.
Землеўласьнікаў з Вялейкі.

У НАВАГРАДЗКІМ ОКРУГУ.

№ 1 Безп. Блёк Супрацоўніцтва з Урадам.
№ 2 P. P. S.
№ 3 Вызваленьне.
№ 4 Бунд.
№ 10 Хлопская партыя.
№ 20 Расейскае народнае аб'яднаньне.
№ 33 Агульна жыдоўскі нацыянальны блёк.
№ 37 Цэнтральны Агульна Беларускі Народны К-т (да Сойму і Сэнату). На першым месцы да Сойму А. Паўлюкевіч, да Сэнату — Т. Вернікоўскі.
№ 38 Грамада.
№ 39 Абароны інтарэсаў работнікаў і сялян (толькі да Сойму).
Беларускіх сялян і работнікаў.

Заява А. Паўлюкевіча аб выхадзе з нашых арганізацыяў.

У Рэдакцыю „Беларускае Слова".

ЗАЯВА.

З прычыны ствары́ўшайся палітычнае сытуацыі ў зьвязку з выбарамі ў Сойм і Сэнат гэтым заяўляю, што з дня 16-2-28 г. я складаю з сябе кіраўнічыя становішчы ў Беларускай Нацыянальнай Радзе, Партыі і ў „Беларускай Хатцы" і выхаджу з яе склада, а так сама і з сябраў Камітэта па справам Самаўрадаў.

Адначасова абыймаю ўсю выбарную акцыю на Наваградчыне і выхаджу зусім з палітычнае працы на Віленшчыне.

А. Паўлюкевіч.

Вільня 15 лютага 1928 г.

Перад выбарамі да Сойму і Сэнату.

ПРАЎНАЯ АБАРОНА ПЕРАДВЫБАРНЫХ САБРАНЬНЯЎ.

Праўную абарону выбараў, а так-жа перадвыбарных сабраньняў на абшары быўшага расейскага забору ўстанаўляе дэкрэт ад 8 студзеня 1919 г. (Dz. Pr. № 5 poz. 96), у якім гаворыцца:

Арт. 4. Віноўны ў перашкодзе дзеяльнасьці перадвыбарных сабраньняў ці выбарных камісіяў да Сойму праз гвалт над асобаю, пагрозаю ўкараньня, абманам, злоўжыцьцем ўлады, псаваньнем лёкалю, вызначанага пад сабраньне, ці штучным сапсуцьцем паветра, калі закон не прадбачыць больш цяжкай кары, караецца:

Турмою на працяг ад 1 да 3 гадоў.

Калі праступленьне зроблена некалькімі асобамі ўзброенымі, дык віноўны падлягае кары:

Турмы на працяг ад 3 да 6 гадоў.

Насільле (гвалт) караецца.

Выданы ў Варшаве 8 студзеня 1919 г.

Начальнік дзяржавы: Я. Пілсудзкі, Прэм'ер Міністраў—Морачэўскі і Міністар Унутраных Справаў—Тугутт.

Выбарная ахрана.

Віленскі Ваявода выдаў 20 лютага загад, у якім прапануе ўсім старостам арганізаваць у памешканьнях выбарных камісіяў спэцыяльную ахрану на 4 і 11 сакавіка. У гэтай інструкцыі ўказваецца на неабходнасьць стараннага падбору асобаў для нясеньня гэтых абавязкаў. Сябры ахраны будуць мець на рукаве чорна-белую павязку з пячаткаю выбарнай камісіі.

Як галасаваць?

Галасаваньне адбываецца ў наступны спосаб: выбаршчык, падыйшоўшы да стала за якім сядзіць выбарная камісія, кажа сваё прозьвішча і імя. Па праверцы праз сябра камісіі, які вядзе пратакол, чы імя і прозьвішча выбаршчыка знаходзіцца ў сьпісках выбаршчыкаў, выбаршчык дастае ад камісіі адштэмпляваны канвэрт да галасаваньня, укладае ў канвэрт картачку з нумарком да галасаваньня і аддае канвэрт старшыні камісіі, каторы, праверыўшы штэмпель на канвэрце і не заглядаючы да сярэдзіны, кідае канвэрт да выбарнай урны (скрынкі). Адначасна сябры камісіі адзначаюць, што выбаршчык голас аддаў.

Галасаваньне пачынаецца а гадзіне 9 раніцай і кончыцца а гадзіне 9 вечарам.

Галасаваньне адбываецца пры помачы картачак з нумаркамі да галасаваньня. Карткі да галасаваньня павінны быць белага калёру. На картачцы можа быць толькі напісана славамі, або цыфрай нумар сьпіска, на які выбаршчык галасуе. Нумар можа быць надрукаваны, або напісаны.

УНЕВАЖНЯНЫЯ СЬПІСКІ.

На пасяджаньні дзяржаўнай Выбарнай Камісіі уневажнены сьпісак № 16 (лявіца P.P.S.) за тое, што было пададзена больш 100 подпісаў асобаў, не карыстаючыхся выбарнымі правамі. Затым уневажнены сьпіскі 23 (Незалежная Хлопская Партыя) і сьпісак „Самапомац" камунізуючай арганізацыі ў Любліне.

ЛІТОЎСКІ СЬПІСАК у СЬВЕНЦЯНАХ.

У сьвенцянскім вокрузе літвіны выставілі свой уласны сьпісак, на першым мейсцы якога фігуруе быўшы пасол Думы Цэўнэліс.

ГАНДАЛЬ МАНДАТАМІ ў БЛЕКУ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯЎ.

Жыдоўская газ. „Unser Express" падае, што на пасяджаньні дэлегатаў жыдоўскіх выбарных камітэтаў, уходзячых у склад нац. меншасьцяў, былі падзелены мандаты на „пэўныя" і „ня пэўныя". За пэўны мандат кандыдат мусіць заплаціць наперад тры месячныя дыеты, што раўняецца 3,000 зл., а за мандат ня пэўны па 1,000 зл. з варункам, што пасьля выбараў даплаціць рэшту.

А колькі заплацілі за беларускія галасы.

НЕПАРАЗУМЕНЬНІ ў БЛЕКУ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯЎ.

Праца блёку нац. меншасьцяў на мейсцах спатыкае ўсе большыя і большыя труднасьці. На Валыні асабліва моцны супраціў ён спатыкае з боку украінскіх партыяў радыкалаў і нацыяналістаў, адкрыта выступаючых проці блёку. На Палесьсі на гэта-жа лініі працуе быўшы дэпутат Васіньчук, стварыўшы украінскі народна-гаспадарчы сьпісак. У Холмшчыне вялікую незадаволенасьць выклікае тое, што на першых мейсцах у сьпіску нац. меншасьцяў выстаўлены не прадстаўнікі славянскіх меншасьцяў.

СЬПІСАК № 13 (КАМУНІСТЫЧНЫ) ПРЫЗНАНЫ ВАЖНЫМ.

Ня глядзячы на тое, што Гэнэральны Выбарны Камісар п. Цар жадаў уневажненьня камуністычнага сьпіску да Сойму і Сэнату № 13 з прычыны фармальных недакладнасьцяў, галоўная выбарная камісія прызнала яго важным, хаця па такім жа матывам былі ўневажняны №№ 16, 23, і 32.

АРЫШТ СЯБРЫ ЦЭНТР. К-ТУ БЕЛ. ХР. ДЭМ.

На днях у Браслаўлю быў арыштаваны сябра Цэнтральнага К-ту Бел. Хрысьціянскіх Дэмакратаў Дварэцкі па абвінавачаньню у тым, што пад відам выбарнай агітацыі вёў камуністычную.

АРЫШТ ДРОБНЭРА.

У Быдгошчы арыштаваны кіраўнік партыі незалежных сацыялістаў Дробнэр з Кракава. Ен абвінавачываецца у дзяржаўнай здрадзе.

АРЫШТ б. ПАСЛА БОНА.

У выніку рэвізіі 6 рольных коапэратываў у палескім вокругу, якія знаходзіліся пад кіраўніцтвам б. пасла з незалежнай партыі хлопскай Адольфа Бона, 9 і 10 лютага быў наложаны арышт на тавары гэтых коапэратываў, а сам кіраўнік Бон арыштаваны.

АРЫШТ б. ПАСЛА ФЕДАРКЕВІЧА.

У Маліна́ўцы арыштаваны быўшы пасол камунізуючай незалежнай хлопскай партыі Федаркевіч.

ЗАБАРОНА ПРАДАЖЫ СЬПІРТАВЫХ НАПІТКАЎ.

Ваяводзтва выдала загад аб забароне прадажы сьпіртавых напіткаў у дні 2, 3, 4, 10 і 11 сакавіка. Загад гэты ўваходзіць у сілу з трэцяй гадзіны папярэдняга дня і прадаўжаецца да 10 гадз. наступнага дня. Апрача грашовага штрафу і арышта ад віноўных будзе тойчас адабрана концэсыя на права гандлю сьпіртавымі напіткамі.

ГІСТОРЫЯ ПРАПАЖЫ НАШАГА СЭНАЦКАГА СЬПІСКУ ПА ЛІДЗКАМУ ВОКРУГУ.

1 лютага ў Маладэчне адбыўся зьезд, скліканы Цэнтральным Агульна-Бел. Народным Выб. К. там з мэтаю вызначэньня кандыдатаў у Сойм і Сэнат і ўлажэньня сьпіскаў кандыдатаў па Лідзкаму Выбарнаму Округу. Зьехаліся прадстаўнікі паветаў Ашмянскага, Валожынскага і Маладэчанскага ў ліку 72 чалавек, з якіх 14 радных і гмінных Самаўрадаў.

У выніку цэла-дзеннае працы ад 11 г. раніцы да 12 уночы быў уложаны Соймавы сьпісак з кандыдатамі — Іванкевічам на першым мейсцы і Др.-Падбярэзкім на другім і прадстаўлены ў Ліду ў Дзяржаўную Выбарную Камісію, дзе і атрымаў № 37.

З сьпіскам-жа ў Сэнат выйшла няпрыемная надта гісторыя. У Сэнат аднагалосна быў выбраны і пастаўлены на першае мейсца п. Тодар Вернікоўскі. Але дзеля таго, што на сьпіску ў Сэнат павінна быць ня меньш 50 подпісаў выбаршчыкаў, якія маюць ня меньш 30 гадоў, на зьездзе не знайшлося даволі асобаў у гэткіх гадох. Дзеля гэтага прыйшлося зьбіраньне подпісаў адлажыць на другі дзень г. з. 2-га г. м.

Пакідаючы гэты сьпісак разам з сьпіскам у Сойм, прадстаўніку К-ту быў зроблены загад завязьці соймавы сьпісак у Ліду, а сэнацкі — згодна з тэлеграмай, якая павінна была быць дадзена з цэнтру. Тэлеграма гэтая дана была 2-га ў 11 гадз. раніцы, пры чым дана была тэрміновая, г. з. срочная. Але гэтая „тэрміновая" тэлеграма прыйшла з Вільні ў Лебедзева толькі 3-га а 8 гадз. раніцай. Тымчасам цягнік у Ліду з Маладэчна ідзе а 8 гадз. раніцы, сьпіскі павінны былі быць пададзены 3-га, як у апошні тэрмін. Паўнамоцнік п. Нехвядовіч выехаў а 3 гадз., г. з. да атрыманьня тэлеграмы, ўзяўшы разам з соймавым і сэнацкі сьпісак. У Лідзе прэзэс Дзяржаўнае Выбарнае Камісіі, прыняўшы сьпісак Соймавы, скіраваў п. Нехвядовіча з сэнацкім, як сам потым прызнаўся, „не разгледзіўшы добра" — ў Наваградак замест Вільні. Дзеля таго-ж, што 3-га быў апошні дзень складаньня сьпіскаў, а з Наваградку ніяк нельга было даставіць сьпісак у Вільню, бо няма цягнікоў дзенных, дый ў Вільні прымаліся сьпіскі толькі да 12½ гадз. дня — сэнацкі сьпісак па Віленшчыне не пайшоў. І п. Вернікоўскі кандыдатуе на першым-жа мейсцы толькі па Наваградзкаму ваяводзтву. (Выбаршчыкі Лідчыны і Валожыншчыны павінны галасаваць за сэнацкі сьпісак Наваградчыны.)

ПАЛІТЫЧНАЯ ХРОНІКА.

З ПОЛЬШЧЫ.

ПОЛЬСКА-САВЕЦКІЯ ПЕРАГАВОРЫ ХВІЛЕВА СПЫНЕНЫ.

З савецкага пасольства ў Варшаве паведамляюць, што ў размове мін. Залескага з паслом Богомолавым абгаварывалася справа аб узнаўленьні польска савецкіх гандлёвых перагавораў, якія не сарваны, а толькі хвілёва спынены. Толькі пакуль не ўстаноўлена, польская дэлегацыя выедзе да Масквы, ці савецкая да Варшавы.

ПАВАРОТ ПОЛЬСКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ З МАСКВЫ.

31 студзеня вярнулася з Масквы у Варшаву польская гандлёвая дэлегацыя на чале з Сакалоўскім і Галуўко. Нямецкая прэса падае, што дэлегацыя вярнулася з пустымі рукамі, бо ўступныя перагаворы з саветамі уткнуліся на мертвым пункце.

НОВАЯ НОТА ЛІТВЕ.

12 лютага ў Рызе была ўручана літоўскаму паслу другая нота польскага ўраду, зьяўляючаяся адказам польскага ўраду на апошнюю літоўскую ноту. У гэтай ноце польскі ўрад катэгарычна жадае адказу Літвы на прапазыкі ў справе перагавораў і адцяняе, што для яго важна ня места перагавораў, а магчыма скарэйшы час.

НАГРАДА МІТРЫПАЛІТА ДЫАНІСІЯ.

1 лютага юга-славянскі пасланьнік у Варшаве Радановіч уручыў Мітрапаліту Дыанісію вялікую стужку крыжа сьв. Савы І клясы. Гэта высокая награда Мітрапаліту Дыанісію выдана Сэрбскім каралём.

НОВЫ ЗАГАД АБ ЭМІГРАЦЫІ.

Міністар працы і сацыяльнай абароны выдаў разам з міністрам заграгічных справаў загад аб частковым спыненьні эміграцыйнага руху з Польшчы. Загад забараняе эміграваць усім асобам, ня маючым у намечанай для выезду стране точных гарантыяў атрымаць зарабак, а також тым асобам, інтарэсы якіх могуць пацярпець дзякуючы выезду.

ПРАЭКТ АСУШКІ ПАЛЕСЬСЯ.

Рада міністраў прыняла праэкт Прэзыдэнта Рэспублікі вельмі вялікае вагі, дзякуючы якому будзе нарэшце зрэалізаваны помысл асушкі Палесься. Справа гэта пасьля доўгіх гадоў будзе вырашана праз устанаўленьне спэцыяльнага меліярацыйнага бюро.

Дэкрэт Прэзыдэнта Рэспублікі прадбачыць стварэньне бюро меліярацыі Палесься, якое будзе знаходзіцца у Брэсьце на Бугу і павінна выпрацаваць агульны праэкт і вартасьць асушкі палескай дрыгвы. Праэкт абхапляе рэгуляцыю рэчак, натуральных і штучных дарогаў, судаходзтва, асушку грунтаў і г. д.

Праэкт абхапляе 10 паветаў Палескага ваяводзтва, 4 — Валынскага ваяв., часткова 2 — Беластоцкага і 3 — Наваградзкага ваяводзтваў. Дзеяльнасьць сваю бюро распачне ў бягучым годзе і павінна закончыць у працягу 4 гадоў.

АРЫШТЫ КАМУНІСТАЎ.

У зьвязку з расьледаваньнем у справе аб антыдзяржайнай дзеяльнасьці камуністычнай партыі Зах. Украіны ў Польшчы паліцыяй зроблены новыя арышты. У Львове арыштавана зноў 5 чалавек, у Луцку — 15, сярод якіх знаходзіцца і б. пасол Чучмай, стаяўшы на чале арганізацыі. Затым зроблены арышты ў Тарнополе, Станіславове і Бродах.

ЛІКВІДАЦЫЯ КАМУНІСТЫЧНА-ШПІЕНСКАЕ АРГАНІЗАЦЫІ.

У апошні час паліцыйныя улады прыступілі да ліквідацыі шпіёнска камуністычных арганізацыяў на тэрэні Зах. Беларусі. Гэткім чынам у Слонімшчыне арыштавана 11 камуністаў, галоўным чынам жыдоў, якія падтрымлівалі кантакт з Менскам і займаліся распаўсюджываньнем перадвыбарнай літэратуры. У Парфянаве арыштавана 4 асобы, аказаўшыяся бальшавіцкімі шпіёнамі, а ласне Маржым, Белняковіч, Пашкоўскі і Валасэвіч.

Цяжкія хвілі для камуністаў.

На мітынгу 8 лютага ў Сьвенцянах выступіў з прамоваю ў чыста-камуністычным духу энпэхавец нейкі Карвацкі, заклікаючы сялянства да галасаваньня за камуністычны сьпісак № 13. Але абмыліўся ў меркаваньнях. Сяляне замест таго, каб пакляскаць аратару, накінуліся на яго і толькі дзякуючы інтэрвэнцыі паліцыі Карвацкі выйшаў сухім. Але каб больш ня баламуціў сялян, Карвацкі быў арыштаваны.

З ЗАГРАНІЦЫ.

Прамова Штрэзэмана.

На пасяджаньні Рэйхстага 31 студзеня Штрэзэман выгласіў прамову аб іностранай палітыцы Нямеччыны. У пачатку ён заявіў, што Нямеччына шчыра імкнецца да згоднае працы з іншымі дзяржавамі над адбудоваю міра ў Эўропе. Аднак-жа гэтую праблему ня можна ставіць на фальшывы шлях. Небясьпеку аднэй ці некалькіх дзяржаваў ня можна будаваць на сродкі другіх дзяржаваў. Далей заявіў, што Нямеччына ўжо ўрэгулявала свае дагаворныя гаспадарчыя адносіны з Англіяй і Злуч. Штатамі, заключыла гандлёвыя трактаты з Гішпаніяй, Партугаліяй, Швэйцарыяй, Бэльгіяй, Францыяй, Італіяй, Галяндыяй, Швэцыяй і рэштаю Скандынаўскіх дзяржаваў, пры гэтым падкрэсьліў, што дагавор з Францыяй мае вялікае палітычнае значэньне. Цяпер Нямеччына ўступіла ў трэці пэрыяд урэгуляваньня гаспадарчых справаў з сваімі ўсходнімі суседзямі. Тутака ўсе труднасьці палягаюць у вырашэньні рольнага пытаньня. Нямеччына стаіць на тым пункце гледжаньня, што нямецкая рольная прамысловасьць павінна ахраняцца, як гэтага патрабуюць варункі ўнутранага рынку. З Чэха-Славакіяй, Польшчаю, Літвою і Грэцыяй перагаворы ўжо пачаліся, а з Аўстрыяй, Вэнгрыяй і Румыніяй у хуткім часе павінны пачацца. З Расеяй пачнуцца новыя перагаворы. Пры гэтым дабавіў, што ў віду неаднолькавых гаспадарчых сыстэмаў у Нямеччыне і Расеі ад новых перагавораў ня можна чакаць якіх небудзь практычных вынікаў апрача аднаго: зьмяншэньня па магчымасьці пры новых перагаворах тых пярэчнасьцяў і недахопаў, якія ўяўніліся пасьля падпісаньня савецка-нямецкага гандлёвага дагавору. Дагавор гэты ня прынёс Нямеччыне той карысьці, якой можна было чакаць, прыймаючы пад увагу вялікія нямецкія пазыкі.

НЯМЕЦКА-ЛІТОЎСКІ ГАРАНТЫЙНЫ ДАГАВОР.

У часе свайго пабыту ў Бэрліне літоўскі прэм'ер Вальдэмарас падпісаў з Штрэзэманам арбітражны дагавор між Літвою і Нямеччынаю. Паводле Нямецкай прэсы гэты дагавор ня мае ніякіх тайных умоваў і вічым не адзначаецца ад трэцейскіх дагавораў, заключаных Нямеччынаю з іншымі дзяржавамі. Гэты дагавор стварыў прыемную атмасфэру для гандлёвых перагавораў, якія павінны распачацца ў хуткім часе.

НЯМЕЦКА-САВЕЦКІЯ ГАНДЛЕВЫЯ ПЕРАГАВОРЫ.

На гэтым тыдні распачаліся ў Бэрліне нямецка савецкія гаспадарчыя перагаворы. У склад савецкай дэлегацыі вайшлі Шлейфэр, Каўфман і Розэмблюм (самыя запраўдныя расейцы! Рэд.). Затым будзе прыймаць удзел савецкі пасол у Бэрліне. Конфэрэнцыя мае сваею мэтаю перагляд папярэдняга гандлёвага дагавору між Нямеччынаю і Радавай Расеяй, вынікамі якога паводле заявы Штрэзэмана ў Рэйхстаге Нямеччына засталася незадаволена.

СПРАВА АБ АКУПАЦЫІ ПРЫРЭЙНСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ.

У зьвязку з парушанаю мін. Штрэзэманам справаю аб эвакуаваньні Прырэйнскай вобласьці парыжская газ. „Echo de Paris" піша, што паводле некаторых крыніцаў Брыян мае замяр запрапанаваць Нямеччыне далейшае зьмяншэньне лічбы акупацыйнага войска на 10,000 чалавек.

АМЭРЫКА АДМАУЛЯЕ КРЭДЫТЫ САВЕТАМ.

З Вашынгону паведамляюць. што амэрыканскі Урад не згаждаецца на пазыку ў суме 30 міл. даляраў для Радавай Расеі, вызначанай быццам на адбудову жалезнай дарогі ў Расеі.

АМЭРЫКА ПРОЦІ ПАДВОДНЫХ ЛОДАК.

З Вашынгтону паведамляюць, што Келаг паведаміў парлямэнтскую камісію заграмічных справаў, што амэрыканскі ўрад гатоў падпісаць з усімі дзяржавамі сьвета дагавор. забараняючы зусім карыстаньне падводнымі лодкамі.

ІТАЛЬЯНСКАЯ ПАВЕТРАНАЯ АРМІЯ.

Італьянскі Ўрад паклікаў да ваеннай службы новых 30,000 салдатаў і адпаведны лік афіцэраў для абароны краю проці атак паветраных флётаў. Уся паветраная армія Італіі будзе складацца з 100,000 чалавек і будзе знаходзіцца пад камандаю гэн. Нобіле.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ УРАД НОРВЭГІІ ПРОЦІ МІЛІТАРЫЗМУ.

Новы сацыялістычны Урад Норвэгіі ўнёс праэкт, на падставе якога ўсе рэгулярныя ваенныя абучэньні павінны быць скасаваны і створаныя падчас вайны дзьве гвардэйскія роты распушчаны. Гэтак сама і абучэньні ваеннага флёту будуць значна абмяжованы. Гэта зменшыць выдаткі на 5 міл. кронаў.

Англійскі урад проці 8-мі гадз. дню працы.

З Жэнэвы паведамляюць, што там выклікала сэнсацыю заява англійскай дэлегацыі на паседжаньні адміністрацыйнае Рады Міжнарадовага Бюро Працы аб тым, што англійскі ўрад ня можа ратыфікаваць вашынгтонскую ўмову аб 8-мі гадзін дню працы. Заява гэта выклікала цэлую буру пратэстаў з боку іншых дэлегацыяў, асабліва дэлегацыі францускай і бэльгійскай. Нямецкі дэлегат заявіў, што Нямеччына згаджаецца ратыфікаваць конвэнцыю аб 8 гадз. дню працы пад адзіным варункам, што яна будзе ратыфіцыравана і іншымі заходнімі дзяржавамі.

ПЕРАД ЗВАЛЬНЕНЬНЕМ 800,000 РАБОТНІКАУ у НЯМЕЧЧЫНЕ.

Саюз нямецкай мэталюргічнай прамысловасьці пастанавіў звольніць з працы ад 22 лютага ўсіх работнікаў мэталюргічнай прамысловасьці. Гэткім чынам усяго будзе звольнена 800,000 работнікаў, у адным Бэрліне — 200,000. Лёкаўт (масавае звальненьне работнікаў фабрыкантамі) выкліканы абвастрэньнем спрэчкі з-за зарабаткае платы і датыкаецца ўсіх жалезнаабрабляючых, машынабудаўляных і элекра-тэхнічных заводаў, як напр. фірмы Сіменса, ў якой працуе 100,000 работнікаў, А Э І., Шварцкопфа і інш.

БЕЗРАБОЦЬЦЕ ў ЗЛУЧ. ШТАТАХ.

З Нью-Іорку паведамляюць, што Злучаныя Штаты ў апошні час перажываюць вельмі вострае безрабоцьце. Ня гледзячы на памысны стан амэрыканскай гаспадаркі паводле афіцыяльных даных лік безработных дасягае 4 мільёнаў. Гэткая вялікая лічба безработных была толькі ў 1916 г. Дзесяткі тысячаў безработных прымушаны зьвяртацца за запамогаю да дамоў для бедных. Перад публічнымі кухнямі стаяць доўгія хвасты безработных.

У. С. С. Р. Р.

СЭСІЯ ВЫКАНАУЧАГА К-ТУ III ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА.

9 лютага адкрылася X сэсыя выканаўчага камітэту камуністычнага інтэрнацыянал. У першы дзень паседжаньня выступіў з дакладам Бухарын аб дзеяльнасьці апазыцыі ў лоне камуністычнае партыі С. С. Р. Р. і III інтэрнацыянала.

ЧУТКІ АБ РЭВАЛЮЦЫІ у ПАЛУДНЕВАЙ РАСЕІ.

„Daily News“ паведамляе з Канстантынопалю, што некалькі турэцкіх газэтаў зьмяшчаюць весткі аб выбуху рэвалюцыі у палуднёвай Расеі. Паводле гэтых вестак радавыя ўлады мабілізавалі значныя марскія сілы з мэтаю стлумленьня рэвалюцыі. Доступ да галоўных Крымскіх портаў закрыты пры помачы мінаў.

БУНТЫ СЯЛЯН НА ПАУДНІ РАСЕІ.

З рожных крыніцаў паведамляюць аб сялянскіх паўстаньнях на Паўдні Расеі, выбухшых на грунце незадаваленнасьці надзяленьня жыдоўскіх каляністаў найлепшаю зямлёю ў Крыму і на Каўказе. Мейсцовыя сяляне маюць ад $^1/_4$ да $^1/_2$ дзесяцін зямлі, ў той час як жыдоўскія калёністыя атрымліваюць па 4—10 дзесяцін. У многіх мейсцах жыдоўскіх калёністаў павыганялі вон, а іх гаспадаркі зьнішчылі. Ахвяры ў людзях значныя. Савецкі ўрад пад уплывам гэтых выпадкаў хвілёва спыніў жыдоўскую калёнізацыю ў гэтых мейсцах і скіраваў яе на Д. Усход.

АРЫШТЫ УКРАІНСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАУ.

У мінуўшым тыдні ў Харкаве Г. П. У. арыштавала некалькі вядомых украінскіх дзеячоў, займаючых адказныя становішчы ў савецкіх урадах, па абвінавачаньню ў „нацыяналістычнай палітыцы“, супярэчнай з дырэктывамі камуністычнае партыі.

ПРОЦІ ЖЫДОУСКАГА ЗАСІЛЬЛЯ.

Маскоўская „Торгово Промышленная Газета“ ад 6 лютага зьмяшчае нябывалы ў бальшавіцкіх адносінах выпадак: ласьне канфіскаваны № 182 харкаўскай газэты „Украінскі Экономіст“ за атрыкул, скіраваны проці калёнізацыі жыдоў на самых лепшых тэрэнах Палуднёвай Расеі. Увесь рэдакцыйны склад газэты арыштаваны. Гэта называецца „своя сваіх не пазнаша“, бо ў Саўдэпіі німа іншае прэсы, як толькі ўрадава-камуністычнае. Вось да чаго абрыдлі ўсім жыды ў Расеі!

ПАЖАРЫ ў САВЕЦКАЙ РАСЕІ.

У Петраградзе і аколіцах у працягу апошніх 3-х месяцаў зарэгістравана 3,000 пажараў. Асабліва часта гарэлі фабрыкі. Радавыя ўлады асыгнавалі 1,000,000 руб. на арганізацыю спэцыяльных пажарных камандаў, абавязкам якіх будзе выключная ахрана фабрыкаў ад пажараў. Гэтак сама ад нявысьветлянай прычыны згарэла сярнічная фабрыка ў „Нова-Барысаве“. Сьледзтва вядзе Г. П. У.

ПАЖАР НАЙВЯЛІКШАГА МЛЫНУ.

Менская „Звезда“ падае, што 6 лютага ў Магілеве згарэў найвялікшы ў Магілеўскім вокрузе паравы млын „Чырвоная Зорка“. Страты вельмі вялікія.

ГРАБЯЦЬ НАГРАБЛЕНАЕ.

„Таймс“ паведамляе, што ў 50 мілях ад Владывастока Г. П. У. затрымала некалькі асобаў, прабаваўшых вывязьці за граніцу золата і каштоўнасьці на 100,000 руб. Сярод затрыманых — быўшы касір петраградзкага аддзелу Госбанку Салаўеў і бугальтэр Турганаў.

ЗАМАХ НА ЧЭКІСТА.

На інспэктара савецкае міліцыі у Беларусі Марголіна зроблен у Менску замах. У момант, калі Марголін, выконываючы такжа абавязкі начальніка Г. П. У., заходзіў у рэстаран невядомы спраўца усадзіў яму нож у галаву. У цяжкім стане Марголін адпраўлен у лазарэт. Віноўнік замаху арыштаваны.

900 ЧАЛАВЕК і 300 КАНЕЙ ПА ЛЬДЗІНЕ.

Савецкі пасол у Рэвелі зьвярнуўся да Эстонскага ўраду з просьбаю аб ратаваньні 900 рыбакоў і 300 каней, якіх унясла адарвеушаяся льдзіна ў Фінляндзкай затоцы ў кірунку адкрытага мора Эстонскі урад абяцаў арганізаваць акцыю ратаваньня.

УСЯЧЫНА.

Цуд навукі і тэхнікі.

Пасьля фантастычных адкрыцьцяў ў вобласьці радыё, як бяздротны тэлеграф, тэлефон і фатаграфаваньне на адлегласьці (між Бэрлінам і Венаю), навука зрабіла ў гэтай вобласьці новыя, проста невазбразімыя пасьпехі. Ласьне мова ідзе аб гэтак званай „тэлевізыі“. ці дальнабачнасьці. Адзін з амэрыканскіх інжынэраў выдумаў невялікі апарат, пры помачы якога можна бачыць за тысячы кілямэтраў, як перад самымі вачыма. А 8 г. веч у Гартэдалі каля Нью Іорку ў невялікім падвальным памешканьні невялікая аўдыторыя пры вопыце бачыла двох чалавек, сядзеўшых у Лёндане каля апарату тэлевізыі, які называецца „электрычным вокам“. Седзячыя ў цёмным падвале бачылі праз 6.000 кілямэтраў, як два чалавекі гулялі па Лёндану. Праўда малюнак быў яшчэ даволі невыразны, але не падлягае сумліву, што далейшыя ўдасканаленьні дазволяць зусім выразна бачыць на 10,000 кілямэтраў, як і на кароткіх адлегласьцях.

Будучыня тэлевізіі надзвычайная як у навуцы, гэтак і ў будучай вайне. Напрыклад вучыцель гэографіі ў Лёндане, паставіўшы апарат тэлевізіі і кіраваўшы яго ў той, ці іншы бок перад слухачамі, можа чытаць лекцыю аб якой небудзь Індыі ці Аўстраліі, а слухачы ў гэты час могуць бачыць гэтыя мейсцы, як на кінэматографічным экране, Гэта будзе вагляды выклад лекцыяў, як у батанічным садзе.

Цяпер возьмем другі прыклад. Напрыклад вядзецца вайна. Пры помачы апаратаў тэлевізіі адзін праціўнік можа бачыць, што робіцца ў тылу другога праціўніка. Ні з чым ня можна будзе схавацца, калі толькі ня будзе адкрыта працівадзейста.

Прадукцыя і вываз амэрыканскіх аутамабіляу.

З агульнае лічбы 27,650,000 аўтамабіляў, знаходзіўшыхся ў руху да 1 студзеня 1927 г., 80% амэрыканскай вырабаткі. У 1928 г. будзе выроблена каля 5 міліонаў новых, што складае 20% павялічэньня. Вываз у першых 11 месяцах 1927 г. дасягнуў 361,000 штук на агульную суму вартасьці 258 міл. даляраў. Найвялікшым рынкам збыту былі Аўстралія (62,000 аўтамабіляў), затым ідуць: Аргэнтына (42,000), Канада (33,000) і г. д.

У Эўропе, асабліва ў Нямеччыне, Францыі і Італіі вядзецца вельмі вострая барацьба з амэрыканскім увозам аўтамабіляў. У Нямеччыну і Францыю увозіцца толькі 8%, Італію—2% амэрыканскіх аўтамабіляў. Ня гледзячы на гэта ў Эўропе прадана ў 1927 г. два разы больш, чым у 1926 г. Што датычыць вартасьці, дык 23% прывезеных амэрыканскіх аўтамабіляў былі ў цане да 500 даляраў за штуку, 62% — ад 500 да 1,200 дал., 11%—ад 1,200 да 2,000 дал. і толькі 3% каштавалі больш 2,000 даляраў за штуку.

КОЛЬКІ КАШТУЕ БЭРЛІНЕЦ?

Бэрлінскі суд вынес вельмі цікавую пастанову. Судзьдзі павінны былі адказаць на пытаньне: колькі каштуе цяперашні бэрлінец? Справа была ў тым, што адзін з жыхароў Бэрліна папаў пад аўтамабіль і страціў жыцьцё. Радзіна патрэбавала ад прадпрыемства адшкадаваньня за сьмерць бацькі ў размеры вартасьці звыклага бэрлінскага жыхара. Суд быў пастаўлены перад трудным заданьнем вылічыць, заработак звыклага бэрлінца і па доўгіх працах вынес асуд, што жыцьцё звыклага бэрлінца варта—30,000 мар., ці каля 60,000 зл.

ЛЕТАЮЧЫ АУТАМАБІЛЬ.

Нямецкі канструктар Эрнэст Гэйнкэ зрабіў вельмі цікавы апарат для лётаньня. Гэты апарат зьяўляецца злучэньнем аўтамабіля з аэраплянам. Крыльля гэтага апарату складаюцца, пасьля чаго ён ідзе па зямлі, як звычайны аўтамабіль, які прыводзіцца ў рух прапэлерам. Апарат мае два рулі: адзін для палётаў, а другі для язды па зямлі.

Тутэйшая хроніка.

— НОВАЕ КІРАУНІЦТВА НАШАЮ ПАЛІТЫЧНАЮ ПРАЦАЮ НА ВІЛЕНШЧЫНЕ. У зьвязку з заяваю п. А. Паўлюкевіча аб злажэньні з сябе кіраўнічага становішча ў Беларускай Нацыянальнай Радзе і Партыі з перанясеньнем палітычнае працы на тэрэн Наваградзкага ваяводзтва кіраўніцтва палітычнаю і асьветнаю працаю на тэрэне Віленскага ваяводзтва перайшло да п. Тодара Вернікоўскага.

НОВЫ ТЫМЧАСОВЫ УРАД Т-ВА „БЕЛАРУСКАЯ ХАТКА ў ВІЛЬНІ“, У зьвязку з выхадам з ураду і складу сябраў Таварыства „Беларуская Хатка ў Вільні“ быўшага старшыні ўраду А. Паўлюкевіча 16 лютага стварыўся новы тымчасовы ўрад т-ва ў наступным складзе: старшыня Тодар Вернікоўскі, сэкрэтар Г. Канапацкі і скарбнік Б. Іужэнка.

— ПРАВЕРКА ДАКУМАНТАУ У КЛЮБЕ „БЕЛ. ХАТКІ“. 10 і 15 лютага ў Клюбе „Беларускае Хаткі ў Вільні“ (Вялікая вул. № 47) паліцыя праверала асабістыя дакумэнты ў прысутных. Ніхто з госьцяў затрыманы ня быў.

— ЧАРГОВЫ НУМАР „БЕЛАРУСКАГА РАДНАГА“. У наступным тыдні выйдзе чарговы (N 3) „Беларускага Раднага“. Рэдакцыя „Бел. Раднага“ просіць паноў Радных прысылаць карэспандэнцыі па адрэсу: Вільня Завальная 6—4.

— ПАШКВІЛІСТЫ. У новай беларускай часопісі „Наша Бацькоўшчына“ (№ 1) Я. Станкевіча зьмешчана другое па чарзе адкрытае пісьмо нядаўнага здрадніка нашых арганізацыяў М. Пятровіча (першае было зьмешчана ў Грамадаўскай Думцы Працы, поўнае брудных інсінуацыяў, абразы і клеветы па адрасу паасобных сябраў нашых арганізацыяў. Чыста бальшавіцкі стыль і зьмест выразна сьведчыць аб тым, што падпісаўшы яго аўтар грае прадажную ролю бальшавіцкага агэнта. Дзеля гэтага лічачы ніжэй сваёй годнасьці ўступаць у публічную палеміку з падобнага рода тыпамі і каб палажыць, нарэшце, крэс далейшым выступленьням М. Пятровіча, аклеветаныя асобы зьвярнуліся да пракурорскае ўлады з просьбаю пацягнуць як аўтара гэтага бруднага пашквілю, гэтак сама і адказнага рэдактара „Нашае Бацькаўшчыны“ да судовае адказнасьці за публічную абразу і клевяту.

— БЛЮЗЬНЕРСТВА ВАР'ЯТА. У беларускай часопісі Я. Станкевіча „Нашая Бацькаўшчына“ (№ 1) зьмешчана адкрытае пісьмо Лук'яна Міцькі, поўнае самарэклямы і брудных лаянак па адрэсу быўшых сваіх хлебадаўцаў. Там зьмешаны гарох з капустаю, як у аўтара яго ўсё перамешана ў галаве: і „Сялянская Ніва“ з Ад. Більдзюкевічам, і „Беларускае Слова“ з Белар. Радаю, Партыяй і асобамі нікому няведамых, Вэрнэраў і Ваўноўскіх, ня маючых нічога супольнага з гэтымі газэтамі і інстытуцыямі...

Наагул можна было-бы перайсьці да дзённага парадку над гэтым блюзьнерствам вар'ята, калі б усім ведама было, што гэта за асоба, якая называе сябе Лук'янам Міцькаю. Прачытаўшы гэты вельмі дарагі для псіхіятра дакумэнт, незнаемы з аўтарам яго можа падумаць, што Міцька запраўды адыгрываў нейкую ролю ў гэтых інстытуцыях, з якіх ён „выйшаў“ невядома з якой прычыны.

Перш-на-перш трэба ацяніць, што гэта вусім дэгенэратыўная і ўмыслова ненармальная асоба, ня здольная абсалютна да ніякай працы ня толькі ўмыловай, але нават фізычнае, для пасылак. Пакрыўджаны прыродаю, ён выклікаў сярод акружаючых ці толькі насьмешкі, ці літасьць. Трымалі яго толькі з літасьці, каб ня выкідаць на вуліцу, з якой падабралі.

Ен піша, што даваў нейкія парады, і што гэтых парадаў ніхто ня слухаў.

Гэта праўда, бо ніхто ня лічыўся з ім, гледзячы на яго, як на пакрыўджанага прыродаю. Яго роля ў адміністрацыі „Бел. Слова“, як экспэдытара, была вельмі маленькая: „Міцька, наклей маркі на газэту і аднясі на пошту, ці аднясі пісьмо на пошту“! і ўсё Але і для гэтага нават ён быў няздольны.

Гэтак сама праўда і тое, што перад ім „закрываліся“ дзьверы ня толькі „Прасьветы“, як ён піша, але і іншых пакояў, каб не псаваў паветра сваею прысутнасьцю.

Вельмі пекна ён піша, як „перайшоў“ ад „Сялянскае Нівы“ да „Бел. Слова“. „З гэтага гнілога балота была простая дарога да самога Паўлюкевіча, куды мне прыйшлося перайсьці ў красавіку летась... Але як яму „прыйшлося перайсьці“, дык не гавора, як роўным чынам не падае і прычынаў таго, што яго змусілі выступіць з гэтым дакумэнтам, сьведчачым аб яго ўмысловым стане. А між тым гэта акурат самае цікавае для чытачоў.

Яго проста вытурылі з адміністрацыі „Сялянскае Нівы“, як непатрэбны баляст. Пан Г. Канапацкі з літасьці парадзіў п. А. Паўлюкевічу ўзяць яго босага і голага да Рэдакцыі газэты, „Бел. Слова“ ў надзеі, што яго можна будзе для чаго небудзь выкарыстаць. Але нажаль абмыліліся. І толькі з літасьці трымалі яго ўвесь час „на эмэрытуры“, пакуль адзін з сябраў Хаткі“ (аб кім ён з зразумелых прычынаў неўспамінае ні слова?) ня выкінуў за каршэнь вон за яго нахальства...

Наагул ня можна за гэтае выступленьне на яго злаваць, бо гэта хворая ўмыслова і фізычна асоба, „простая дарога“ для якой толькі да.. псыхіятрычнага шпіталю.

— АРЫШТЫ СЯРОД ГРАМАДАУЦАУ. Ліквідацыя камунізуючай Грамады ідзе далей. У працягу 31 студзеня і 1 лютага віленская паліцыя дакапала шэрагу новых арыштаў і вобыскаў сярод грамадаўцаў. Арыштаваны былі між іншымі Савіцкі — сэкрэтар т-ва Беларускае школы (філія Грамады), Л. Мэнке — адзін з паважнейшых сябраў Грамады, В. Грышкевіча—вучыцель беларускай гімназіі і Я. Карп — кіраўнік беларускай кнігарні. Быў між іншым зроблены вобыск у раднага віленскага магістрату Кузьмы Крука, інспэктара беларускай гімназіі Марцінчыка. Першага вечарам былі зроблены новыя вобыскі сярод грамадаўцаў.

Затым арыштаваны Рэшэтаў, Скука б. старшыня Грамады ў Глыбокім, Ярковец — дырэктар банку Грамады ў Глыбокім, Несьцяровіч і Рэдзька. Некатарыя з арыштаваных абвінавачваюцца ў шпіянажу.

— БЫЎШЫЯ „НЯТЫКАЛЬНЫЯ„ ПЕРАД СУДОМ. Пракурорскія Ўлады выступілі перад Акружным Судом у Вільні з жаданьнем пацягнуць да судовае адказнасьці быўшых паслоў Фэлікса Галавача, Антона Шапеля і Ул. Шакуна Першы абвінавачваецца па 129 арт К. К. за заклік да зрываньня існуючага палітычнага ладу. А. Шапель па 102 пар. К. К. за належнасьць да Сьвенцянскае „Незалежнае Хлопскае Партыі“ і 154 пар. К. К. за абразу Віленскага Акружнага Суда ў студзені мінуўшага году ў часе публічнае прамовы. Шакун па 532 і 142 п. п. К. К. за абразу касіра на станцыі Ліда і спраціўленьні з аружжам у руках паліцэйскаму пастарунку. Справы Шапеля і Шакуна будуць разглядацца ў Віленскім Акружным Судзе ў другой палавіне лютага. Усе яны цяпер сядзяць арыштаванымі.

— РАГУЛЯ НА ЛАВЕ АБВІНАВАЧАНЫХ. Быўшы пасол Рагуля атрымаў ужо акт абвінавачаньня і 27 лютага засядзе на лаве абвінавачаных у Наваградзкім Акружным судзе па абвінавачаньню з 129 арт. К. К. за прапаганду на карысьць Усх. Беларусі.

13 лютага распачаўся ў Вільні разгляд шпіёнскае арганізацыі, ў якой між іншым сярод абвінавачаных фігуруе жонка б. пасла Баліна, ўцёкшага да Саўдэпіі яшчэ перад разьвязаньнем Сойма.

— АРЫШТ РЭДАКТАРА „САХІ“. Па загаду органаў грамадзкай бясьпекі быў зроблены вобыск ў памешканьні рэдактара беларускае часопісі „Саха“ Павелковіча, у выніку якой быў знойдзены кампрамітуючы матэр'ял і Павелковіч арыштаваны.

— АРЫШТЫ ЛІДЭРАУ ЛЯВІЦЫ P. P. S. у ВІЛЬНІ На днях у Вільні быў арыштаваны сэкрэтар віленскага камітэту лявіцы P. P. S. Тарасаў, а ў ночы на 6 лютага пасьля вобыску быў арыштаваны другі сябра лявіцы P. P. S. радны віленскага магістрату Дзедзюль.

— ВОБЫСК у ІНСПЭКТАРА ВІЛЕНСКАЙ БЕЛ. ГІМНАЗІІ. У ночы на 12 лютага быў зробляны вобыск у інспэктара Віленскай Беларускай Гімназіі Марцінчыка.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Да Нашых Весак!

Голас Аддзела Бел Т-ва „Прасьвета“ у весцы Румянцава, Маладэчанскага пав.

БРАТЫ СЯЛЯНЕ!

У сучасны момэнт, калі надыходзяць новыя выбары да Сойму і Сэнату, мы паста-

навілі падаць перасьцярагаючы голас для сваіх братоў, якія сяньня несьвядомыя ў палітыцы і для тых, каторыя падупалі пад самазваныя беларускія палітычныя крамкі, якія цяпер растуць, як грыбы пасьля дажджу.

Паслухайце нас, як сваіх братоў, якіх зьвязвае штодзеннае жыцьцё, гора, беднота.

Новыя выбары, да якіх мы падыходзім, маюць вялікае значэньне для Беларускага Народу, для нашага беднага сялянства. Бо пры сучаснай новай палітыцы Маршалка Пілсудзкага наша прадстаўніцтва будзе ў магчымасьці многа прынясьці карыснага для нашай вёскі. Дык нясл.ухайце, дарагія браты, агентаў самазваных беларускіх партыяў, прадаўшыхся жыдом ці бальшавіком, бо, апрача абяцанак і турмы, нічога не дадуць нам! Мы мусім грамадой іесьці на выбары і аддаць свае галасы за той сьпісак, на якім будуць выстаўляны намі самымі кандыдаты, гэта той сьпісак, які выставіць Беларуская Нацыянальная Рада і Партыя! Бо толькі Б. Н. Р. і П., ёсьць нашай апякункай, і яна толькі ўказвае шлях да лепшае будучыні. І мы верым, што ўсе тыя нашыя браты, якія сяньня падупалі пад уплыў самазваных беларускіх партыяў, пакаюцца ў гэтым і зьвернуцца да В. Н. Р. і П., якія ўжо здолелі ўзяць пад свой сьцяг не адну тысячу беднага люду, каб павясьці да лепшае долі!

Мы ў поўнай веры, што ўсё сялянства — нашы браты — пойдуць пад сьцяг Беларускай Нацыянальнай Рады і Партыі і аддадуць свае галасы толькі за гэты сьпісак!

Аддзел Бел. Т-ва „Прасьвета" у в. Румянцава, Малад. пав.

28 1-28 г.

Перасьцярога.

Браты Беларусы! Перад намі стаіць вялікая задача. Каму дарагі інтарэсы сваей Бацькаўшчыны Беларусі, хто хоча шляхам мірным, шляхам здаровым нажыць сабе свабоду і дабрабыт, той павінен паважна задумацца над гэтым заданьнем. Паўстала столькі беларускіх палітычных групаў і партыяў, што нашаму вяековаму селяніну і зьлічыць трудна. Дык што мы павінны рабіць? За кім мы павінны іесьці, асабліва цяпер, у час, выбараў да Сойму і Сэнату? Дык кожны падумайце і напішыце свае думкі да Рэд. „Беларускае Слова".

Я гэтак сама шмат праверяў і прыглядаўся да ўсіх беларускіх арганізацыяў. Хацеў ведаць, хто чым дыша да нашага беднага селяніна-беларуса. Возьмем, напрыклад, былую нябожчыцу Грамаду. Яе шлях вядзе нас да чырвонага пекла, да таго камунізму, ад якога і сяньня яшчэ плача ўся Расея, ад якога мільёны памёрлі ад голаду і тэрору. А што цяпер робіцца ў Кітаі Пачытайце газэту. Там вы убачыце братабойчую вайну, там вы ўбачыце рэкі крыві ні ў чым непавінных кітайцаў. А чаму гэта так стала? Таму, што кітайскі народ дапусьціў да агітацыі камуністаў. Але там яны ужо дачакаліся таго, што з імі абходзяцца, як з шалёнымі сабакамі. Дык, Браты Беларусы! Усе як адзін станьмо моцнаю сьцяною на абарону сваёй вёскі проці камуністычнае заразы! Каб яна не магла атруціць наш беларускі народ. Яны абяцаюць і скасаваньне падаткаў і зямлю чужую дзяліць (бо сваей ня маюць). Вынікам яе шкадлівае працы было тое, што усе турмы перапоўнены беларускаю моладзьдзю. Дык гэта мыльны і шкадлівы шлях. Тое самае будзе і цяпер.

Дык я заклікаю. Гэй!!! Браты Беларусы! Хто яшчэ мае хоць каплю не затрутай крыві. У кім б'ецца сэрца чыстага беларуса. Хто цэніць сваю Бацькаўшчыну Беларусь. Хто даражыць сваім кавалкам зямлі. Хто шчыра стаіць на шляху здаровым, лягальным, хто жадае добра сабе і свайму маладому пакаленьню — усе як адзін гуртуймася каля Бел. Нац. Рады і Партыі, якія вядуць нас па шляху мірнаму і лягальнаму да лепшае будучыні. Дзеля гэтага мы усе кінем свае галасы за сьпісак Цэнтральнага Агульна-Беларускага Народнага Камітэту.

Олесь.

27-І. 1928 г.

Перадвыбарныя абяцанкі.

(*Браслаўскі павет*)

Прыйшоў час, калі ня можна маўчаць, бо ўсе партыі ў гэты час заварушыліся. Кожная партыя маніць — завець, на'т гоніць у сваю партыю з мэтай, каб атрымаць як найбольш галасоў, а значыць пасольскіх мандатаў. Кіньце вокам на вёскі: там хмары агітатараў. Кожны цягне ў свой бок, кожны абяцае зямлю, ваду, ўсё дарма. У нашым кутку пабывалі рожныя агітатары, але народ наш, навучаны вопытам з 1922 г., уважна сачыць за кожным крокам гэтых панкоў. Ад усялякіх партыяў былі агітатары, як я сказаў раней, толькі ня было ад аднэй партыі, якая стварыла Цэнтральны Агульна-Беларускі Народны Выбарны Камітэт, на каторую нашыя сяляне прыглядаюцца, як на найсправядлівейшую, якая ня гоніць нашыя маладыя сілы ў вастрогі, як гэта рабіла і робіць Грамада. Нашыя вёскі Браслаўскага павету толькі чакаюць, каб хутчэй даведацца, які № нашай партыі, за каторую як адзін будзем галасаваць.

Даволі гнаць у вастрогі нашыя маладыя сілы, каторыя сяньня так патрэбны маладому Беларускаму Народу! Дык усе гуртуйцеся каля Цэнтральнага Агульна-Беларускага Народнага Выбарнага К-ту.

Усе да працы на карысьць Бацькаўшчыны!

Беларус.

„Оптам і ў розьніцу".

(*Гародзькі, Валожынскага пав.*).

Наступіла пара зьезды рабіць і рыбку ў мутнай вадзіцы лавіць; вось 26-І панаехалі сяляне волю народную тварыць, каб як кольвечы лісту Сэймовую для „Венкшосьці" стварыць. Прыехалі і панкі з Цэнтралі, і нейкія паперы на мандаты ад сялян адтрымалі, каб ніхто не сказаў, што яны іх укралі, а як быццам на зьездзе за іх усе галасавалі.

Дык вось панкі з Цэнтралі ўсе першыя мандацікі на паслоў сабе забралі, але хто голас свой за іх 4 сакавіка аддасьць, той сваесьця свайго Народу прадасьць...

А бедныя „Каралі" (ідэйная апазыцыя), як дурні стаялі, бо агледзіліся, што ад іх выбарныя правы адняли і як яны не пратэставалі, рукамі не махалі, толькі прозьвішча за гэта „Паўлюковых агентаў" дасталі: вось яшчэ ня было пячалі, дык чэрці накачалі...

Вышла з гэтаго дзіўная штука — усім „Каралям" навука, панкам з Цэнтралі кандыдатуры ўцьвярджаць, бо німа чаго тут ад мандатных коршуноў справу ратаваць (калі кругом бутэлечкі стаяць).

Дык вось што нарабілі „венкшосьці" дзеля нашага стыду — прыкрасьці і справа па ўсім швам разлятаецца, а панкі толькі на Варшаву аглядаюцца... Там яны будуць па свайму Беларусь ратаваць, сялянам бяз выкупу зямлю раздаваць, а сабе маёнтачкі ці хаты купляць. А мы, кабеты, пастанавілі на ўсіх зьездах бываць, каб дагледаць, як панкі мандацікі „оптам і ў розьніцу" будуць прадаваць.

А як нідзе нічога лепшага ня чуваць, дык пастанавілі байкот на выбарах аб'яўляць: няхай выбіраюць панкоў без удзелу жаноцкіх галасоў, бо сорамна сваю справу прадаваць і уніятаў на паслоў выбіраць.

А вы, апякуны Беларускага Народу, калі ня хочаце іесьці з кабетамі на згоду, дык прыйдзе час, калі мы вас усіх з дарогі прапром і ніводнага мандата вам не дадзём, бо вы іх то прапіваеце, то заграніцу адсылаеце, то з аднэй партыі ў другую нерапятаеце,... дамкі, зямельку сабе купляеце, з даносамі да Міністраў лятаеце, а ў газэтах як быццам іх лаеце, а самі сабе другое на вус матаеце: як бы мандацікі зноў здабыць, дзеля чаго блёк—„Венкшосьці", — ці там якую хваробу — стварыць.

А як паглядзіш у глыбіню гэтай работы, дык не пералічыш няшчасьцяў аж да суботы, бо гэтыя ж сябры—такія істоты і нарабілі яны нам толькі заботы...

Вясновая скрыпачка.

28-І 1928 г.

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаем гэтую карэспандэнцыю, хаця ня зусім падзеляем пагляд аўтаркі адносна ўдзелу беларускіх жанчын у выбарах. Што беларускія мандаты распрадаюцца „оптам і ў розьніцу", з гэтым можна згадзіцца. Але не верыцца, што „прыйдзе час, калі беларускія жанчыны не дадуць мужчынам ніводнага мандату". А ўрэшце... чым бы дзіця ня цешылася, абы толькі ня плакала...

Аб нашым жыцьці.

(*Лужкі, Дзісьнен. пав*).

Гэты раз пішу корэспандэнцыю, маючы на думцы выявіць абставіны нашага жыцьця. Вось усё у галаве цяпер выбары Дый ня ў мяне аднэй стаяць у галаве выбары, а як мне здаецца, дык у кожнага тое самае. Так яно і ёсьць, бо з блёку нацыян. меншасьці ўжо д нашых Лужак агітатараў панаяжджала, поўна. Сярод іх знаходзяцца і такія, што агітуюць хоць і за іх грошы, але ня ў іх карысьць. Дый нічога дзіўнага. Ведама гарачая пара, так ці гэтак, абы вырваць адкуль-небудзь залатоўку. Але ня ў тым справа. Зьяўляецца пытаньне, адкуль бяруцца грошы на агітацыю? Кажуць, што Сялянскаму Саюзу і Хрысьц. Дэмакрацыі даў грошы на агітацыю жыд Шарашэўскі. Дык ізноў зьяўляецца пытаньне, дзеля чаго патрэбна жыду памагаць беларусам? Сягоньня ня веру ні ў адну палітычную партыю, хай яна высылае найздальнейшых сваіх агітатараў. Усе яны цяпер раздаюць зямлю для сялям.

У далейшым нам трэба ведаць, за што хапацца, каб часам не аддаць дармна свае галасы і ня прынясьці гэтым сабе шкоды.

Трэба нам выбраць шлях, па каторому мы пойдзем да лепшай будучыні не з гарачай галавой, а зусім цьвяроза і лёяльна да ўраду. Бо ж нашы павадыры сваёй ідэолёгіяй, сваім недаверрам да ўраду пэўне ніколі нас ня вызваляць з бяды. Нехта скажа: „раз вы робіце так, дык мы вас гэтак". І у запраўды лёгіка ясная. Ці-ж гэта можна назваць полёнофільствам? Не, тут проста крык роспачы! Бо каб часам не здарылася таго, што „пакуль сонца ўзойдзе, дык раса вочы выесьць". Трэба шукаць шляхоў, па каторым можна-б было іесьці з цьверозай галавой. Бо старае ўжо абрыдла, надаела.

Часамі аб „Грамадзе" гутараць. Быццам на астатак зьбіраецца пабіць рэкорд у выбарах.

Адным словам усе ў будучыні, а цяпер яшчэ нічога рэальнага не выяўляецца.

У культурным напрамку наша ваколіца нічога не праяўляець, апрача таго, што ў вёсцы Ізабэліне на другі дзень праваслаўных Калядаў быў наладжаны сьпэктакль і як казаў арганізатар гэтага сьпектаклю Я. Тарыкаў, дык пьесы: „Заруч. Паўлінкі" і „Зьбянтэжаны Саўка" адыграны былі аматарамі-артыстамі вельмі добра. Публіка перапоўніла ўсю салю і засталася задаволенай са сьпектакля, а на пасьледак выявіла пажаданьне каб у хуткім часе ізноў што колечы было пастаўлена.

Як даведалася, дык ува ўсей Дзісьненшчыне на другі дзень Калядаў было пастаўлеса 8 сьпэктакляў.

З гэтага можна бачыць, што культурная праца на нашых загрубелых вёсках паволі шырыцца.

У эканамічна-гаспадарчым напрамку найгорш дае сябе адчуваць труднась даставаць апалу. Па казённых лясох дагэтуль іставала цана на дровы за мэтр 80 гр., а цяпер ужо павысілася да 2 залатовак. Дый як нашым сялянам у казённы лес ехаць далёка (15 — 20 вер.), дык выходзе зусім дрэнна. Што тычыцца памешчычых лясоў, дык там нашаму незаможнаму селяніну дакупіцца дроў зусім немагчыма. Купцы жыды плацяць за лес гэткія грошы, што селяніну і падумаць страшна, напрыклад: за 8-мі футову сажань куб. ёлкі плацяць 60 руб. золатам, а за сажань асіны аж 100 руб.!

Хай-жа папрабуе купіць селянін!

Хутка праз 5—6 гадоў у нас дроў зусім ня будзе.

Дык што-ж тады будзем рабіць? Ці не пара каму колечы падумаць, каб спыніць прадажу купцам лесу?

Вось і ўсё, аб чым мне хацелася напісаць.

Яніна.

Абразкі з савецкай Беларусі.

СУД.

„Савецкая Беларусь" (N 11) зьмяшчае цікавую хроніку пад назваю „Суд", красачна малюючую адносіны савецкіх служачых да сваіх абавязкаў.

— „Грамадзянін вёскі Баровое, Койданаўскага раёну, Уладзімір Казёл быў абраны ўпаўнаважаным па ахове лясоў мясцовага значэньня.

Ідучы з агульнага сходу, Казёл гаварыў: „Трэба паслужыць вобчыству, буду сумленна выконваць свае абавязкі, буду ахоўваць лес, бо ён у нашых умовах складае вялікую каштоўнасьць".

Але ня так здарылася, як абяцаў Казёл. З першых-жа дзён ён забыўся, што нясе адказную грамадзкую службу.

У Меншчыне ма' быць і ня знойдзецца такога добрага сябра лясоў, якім аказаўся Казёл. Дабрата яго складалася з таго, што калі яму казалі, што ў лесе шмат парубкі, то ён пакруціць галавою, пачэша патыліцу і без усякага хваляваньня адкажа:

— На тое і лес, каб яго сячы. Не ў капусьце-ж яго варыць.

Калі ў лесе зрабіліся вельмі вялікія высячаныя паляны, некатарыя сяляне звароваліся да Казла і пыталіся:

— А скажы, Уладзімір, ці з гэтага дрэннага нічога ня выйдзе?

— Што тут можа быць дрэннага? Што возьмеш, будзе тваё! Ня будзе лесу, ня будзе і клопату.

Сячы лес ехалі ўсе—каму трэба і каму ня трэба. А калі часамі Казёл сустрэкаў сялян з насечаным лесам, дык толькі пытаўся:

— Ну, як, Сымон, лес яшчэ ёсьць?

— Абы здароўя, братка, лесу хопіць.

Гэтак жартаваў з лесам Казёл, пакуль ад салодкага сну прачнуўся мясцовы Р.В.К., але 570 лепшых дрэў на суму 1,202 руб. былі выраблены. Казла за гэткую службу прыцягнулі да адказнасьці, але і на судзе вінаватым ён сябе ня прызнаў і паказаў наступнае:

— Лесу не пільнаваў, бо ня было часу, а пратаколаў на вырубшчыкаў не складаў, бо ня было паперы, а да таго-ж я няпісьменны.

Менскі Акругавы суд прыгаварыў Уладзімера Казла на 1 год і 4 месяцы зьняволеньня, скараціўшы гэту кару на палову па амнэстыі".

Прачытаўшы гэтую хронікёрскую зацемку, мімаволі напльвае пытаньне: За што іменна быў укараны гэты „Казёл адпушчэньня" камуністычнага раю? Ці-ж ён ня верны пасьледавацель вучэньня бальшавікоў: „граб награбленае?" Калі Казла асудзілі на 1 год, дык усіх тых, хто сядзіць у Крамлі, даўно трэба было растраляць — за тое, што самі грабілі, жывуць на награбленае і вучылі ўсіх грабіць, пакуль не захапілі ўлады ў свае рукі. А цяпер караюць самых лепшых сваіх пасьледавацеляў.

А ДРОУ НЯМА.

А вось „Сав. Бел." (№ 13) зьмяшчае пад гэтым загалоўкам яшчэ гэткую гумарыстычную карэспандэнцыю з Сярэднікаў, Слуцкага пав., так сама малюючую савецкія парадачкі:

— Кожны год лясьніцтвы распрадаюць сялянам лес. Вось і сёлета надыйшоў сэзон для куплі і перавозкі дроў.

Грэскае лясьніцтва дало згоду прыслаць у Сярэднікаўскі сельсавет лясьнічага, які-б і распрадваў лес. Сельсавет загадзя парупіўся і сабраў з сялян за дровы грошы. Вось тут і пачалося чаканьне лясьнічага.

Чакаем тыдзень, чакаем другі, чакаем месяц, чакаем яшчэ два тыдні ..

А лясьнічы як скрозь зямлю праваліўся. І па гэты час няма... Грошаў за дровы ўжо як няма, дык няма. Сялянства, дапальваючы апошняе ламаччо і трэскі, такімі парадкамі не задаволена (якжа-бы быць здаволеным?!.. *Рэд.*).

Ці не паснулі там у Грэскім лясьніцтве?

Янка Рабіна.

Чакайце, Сярэднікаўцы!... Можаце быць пэўны, што не дачакаецеся лясьнічага, пакуль будзе існаваць савецкая „работніцка-сялянская" ўлада!

Паштовая скрынка.

Я. Шпаковіч. 4 зл. атрыманы, Газэта высылаецца

Рудніцкі — газэта Вам высылаецца з N 1.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі.

Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9.

Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.